# ЛИТЕРАТУРОВЕДЕНИЕ

**УДК 82.09**

## ДА СІСТЭМАЎТВАРАЛЬНАГА ВОБРАЗУ Ў АРХЕТЫПІЧНЫМ СТРОІ ПАЭМЫ Я. КОЛАСА «НОВАЯ ЗЯМЛЯ» І А. МІЦКЕВІЧА «ПАН ТАДЭВУШ»

***канд. філас. навук, дац. А.П. НІЯКОЎСКАЯ (Полацкі дзяржаўны універсітэт)***

*Паэма Я. Коласа аналізуецца як своеасаблівы і ўсвядомлены дыялог з А. Міцкевічам, як прадаўжэнне філасофскіх роздумаў вялікага паэта-рамантыка ў новую гістарычную эпоху.*

Падабенства двух твораў славянскай культуры - «Пана Тадэвуша» Адама Міцкевіча і «Новай зямлі» Якуба Коласа - бясспрэчнае. Не трэба спецыяльнага даследавання: чытач, знаёмы з дзеямі славянскай культуры, не можа гэтага не заўважыць. Велічны подых эпасу, агульная эпічная прастора - вось што аб'ядноўвае абедзве паэмы. Свет, які гіне і адраджаецца на ростанях гісторыі.

Істотная адзнака эпічных твораў - тое, што яны заснаваныя на гістарычных падзеях, на паданнях, дзе гістарычны факт, страціўшы дэтальныя падрабязнасці, успрымаецца пачуццёва, задаючы настрой, дапамагаючы ўспрымаць чалавека і свет. Такім паданием з'яўляецца для беларусаў успамін аб слаўным мінулым іх Айчыны.

«Пан Тадэвуш» і «Новая зямля»- гэта, у адрозненне ад старажытных эпічных твораў, «штучныя эпасы». Старажытныя эпічныя песні - кампазіцыйна аднапланавыя, іх сюжэтныя лініі абрывачныя. У «штучна-эпічным» творы апавяданне «аўтарскае» вельмі дакладнае, замаруджанае. Сюжэт - ускладнены, цыклізаваны, ёсць устаўныя эпізоды, размоўныя сцэны, карціны душэўных перажыванняў героя. «Штучна-эпасны» твор мае канкрэтнага аўтара. Але ідэі, эмоцыі - старадаўнія, стыль - народны, выражэнне пачуццяў, ацэнак - непасрэднае, мова, верш - простыя [1, с. 57 - 60].

Абедзве паэмы спецыфічна адлюстроўваюць розныя перыяды ў жыцці Літвы-Беларусі. Адам Міцкевіч у сваім творы з дыстанцыі часу апісвае «paradise lost», згублены рай - Літву, край свайго дзяцінства і маладосці. Міцкевіч-эмігрант паказвае правінцыяльны свет літоўскай шляхты 1811 - 1812 гг., ён ужо ведае аб трагічным лёсе гэтага ўтульнага кутка, прадбачыць новыя выпрабаванні, пошукі новых шляхоў жыцця народа, з-пад якога «знікае зямля». Чэслаў Мілаш нездарма называе Міцкевіча «pogrobowcem dawnej Rzeczypospolitej» [2, с. 270].

Паэма Якуба Коласа «Новая зямля» нарадзілася як задумка на пачатку XX ст. Колас тады быў разлучаны з роднымі мясцінамі. А нарадзіўся ён пад тымі ж сузор'ямі, на той самай зямлі, што і Міцкевіч, дзе жывуць беларусы і зараз. Міцкевіч піша свой твор пасля філасофскага асэнсавання падзей канца XVII - пачатку XIX ст. Падзелы Польшчы, яе жыццё пад «zaborami», барацьба за незалежнасць - тэта, па сутнасці, частка гісторыі і нашай Айчыны.

Аўтар «Новай зямлі» ніколі не забываў, што ён - Канстанцін Міцкевіч. Вялікі дух геніяльнага земляка завяшчаў яму працягваць распачаты сказ, паказаць далейшыя пошукі народам сваёй Айчыны, самога сябе, сваёй «Новай зямлі». Вялікія паэты дапамагаюць нам пачуццёва ўявіць нашу гістарычную сітуацыю, зразумець сёння, «як далёка нам яшчэ да Беларусі», усвядоміць новыя этапы нараджэння беларускага грамадства, пакутлівы шлях развіцця беларускай нацыянальнай культуры, дзяржавы, чалавека-беларуса з яго адметнымі асабовымі рысамі, маральна-псіхалагічным складам.

У паэмах- разбурэнне старога светапогляду, старой карціны свету, адмаўленне ад старой міфалагемы, пошукі новага разумення свету. Бо свет у паэмах - гэта чалавек, які прыходзіць да ўласнага лёсу, шукае сябе і «зямлі свайго існавання». Так сялянскі сюжэт аб набыцці кавалка зямлі ператвараецца ў Коласа ў аповяд, роздум пра стварэнне новага жыцця для чалавека і народа. Паэма Я. Коласа ўбачыла свет у першай чвэрці XX ст. Адам Міцкевіч напісаў свой твор значна раней, у 30-я гады XIX ст. Абедзвюм паэмам уласцівы смутак, бо аўтары, у адрозненне ад сваіх герояў, ведаюць, што было «потым», але не могуць дапамагчы, перасцерагчы, хоць не пакідаюць сваіх герояў ні на хвіліну, раючыся з чытачом аб магчымых перыпетыях дзеяння.

Спрэчкі аб жанры - няўдзячны занятак. Вызначыць жанр «Пана Тадэвуша» і «Новай зямлі» цяжка. Азначэнне гэтых паэм як твораў «штучнага эпасу» найбольш адпавядае сутнасці справы. Можна яшчэ дадаць, што гэтыя паэмы спалучаюць рысы эпасу і лірыкі. Гэта жанр, уласцівы паэзіі рамантызму. Бо менавіта ў XIX - пачатку XX ст. адбываецца выхад літаратуры ў рамантызаваны эпас (ці ў эпасны рамантызм?) у сувязі з новымі этапамі руху па абароне нацыянальнай справы.

На пачатку XX ст. нараджаецца неарамантычная канцэпцыя чалавека. Мастакі імкнуцца выйсці за межы соцыума ў разуменні сутнасці чалавека - супраць інтэлектуальна-лагічных пабудоваў філасофіі і культуры Асветніцтва, верыфікацыйных падыходаў да чалавека, яго светапогляду і дзейнасці, уласцівых пазітывізму. Новая культурніцка-філасофская сітуацыя заўсёды мае вельмі шырокі характар (агуль-

наеўрапейскі, сусветны...). Але кожны паасобны народ уключаецца ў яе з уласнае нагоды, з прычыны асаблівасцяў свайго жыцця і спосабу перажывання.

У новую культурніцка-філасофскую сітуацыю Беларусь уваходзіць не так, як іншыя краіны Еўропы. Філасофія жыцця заклікала літаратурных герояў шукаць самотнасці ў дзікай прыродзе, уцёкаў з душнай цывілізаванай няўтульнасці гарадоў. На Беларусі гэтая філасофія (і разам з ёю неарамантычныя матывы ў літаратуры) нараджалася таксама з сацыяльнага неспакою. Але гэты неспакой меў іншыя вытокі: трагічны ўзровень індывідуальнай сацыяльнай суб'ектнасці на Беларусі яшчэ не быў дасягнуты. Жыхару беларускай зямлі трэба было яшчэ перажыць трагедыю выхаду на гэты ўзровень з'явы чалавека, на новую ступень праяўлення ягонай сацыяльнай сутнасці.

Якуб Колас адчуваў змены, якія адбыліся ў беларускім грамадстве. Беларусь, перажыўшы другую палову XIX ст., прымусіла сваіх інтэлектуалаў зрабіць культуралагічна-філасофскія высновы аб неабходнасці рэвалюцыйных змен. Пісьменнікі, паэты ў сваёй творчасці намагаліся нібы «дарабіць» тое, што не ўдалося ў палітыцы, эканоміцы. Буржуазна-рэвалюцыйныя працэсы змянілі светаўспрыманне чалавека: ён захацеў стаць сабой на сваёй зямлі. Гэты агульны «дух часу», сэнс рэчаіснасці разумеў Я. Колас. Ён бачыў межы гістарычнага часу, заўважаў у нетрах грамадства нараджэнне новых, яшчэ не зусім ясных, тэндэнцый развіцця. Паэма «Новая зямля» - не бытапіс. Працягваючы маральна-псіхалагічны, ментальны строй «Пана Тадэвуша», Колас робіць пабытовы каларыт асновай маральна-псіхалагічнага пранікнення ў складаны свет чалавечай душы. І ў А. Міцкевіча, і ў Я. Коласа - зварот да роднага кута («Мой родны кут...!»- «Litwo! Ojczyzno moja...»), зварот да персаніфікаванай роднай прыроды, сакралізацыя роднай зямлі. Родны кут дабразычліва благаслаўляе дробныя людскія справы ад імя будучыні, ад імя Бога. Гэта аснова трываласці свету для тых з нас, хто хоча «людзьмі звацца».

У паэме «Пан Тадэвуш» А. Міцкевіч распавядае аб людзях і падзеях, якія ўжо «мінулі з ветрам» на ростанях гісторыі. Герояў у час апавядання ўжо няма на Літве, падзагаловак «Ostatni zajazd na Litwie» нададзены паэме нездарма. Твор А. Міцкевіча прасякнуты смуткам: літоўскай шляхты няма і не будзе[1]. Але чытач не ўспрымае паэму як гісторыю толькі шляхецкую, бо адчуваецца прысутнасць усяго народа, яго агромністай духоўнай моцы, складанай і багатай гісторыі. Прыгоды міцкевічавых Сапліцаў, іх уяўленні пра чалавека і свет А. Міцкевіч апісвае вельмі падрабязна, увесь час уводзячы ў аповяд і гістарычны, і архаічна-міфалагічны ўспамін. Народ у паэме - не «фон» апавядання, тэта нешта падобнае да хору ў трагедыях Старажытнай Грэцыі. Героі мысляць агульнанароднымі вобразамі, маюць агульныя спрадвечныя першавобразы-архетыпы свядомасці, якія ўдзельнічаюць у міфатворчасці. Па сутнасці, А. Міцкевіч гаворыць нам, што людзі і цэлыя грамадскія групы гінуць, губляючы сувязь з першавытокамі быцця ў выніку гістарычных «скідаў» цэлых пластоў грамадства. Бо міф - гэта «бясконцы працэс сімвалізацыі, які цягнецца праз эоны і, з'яўляючыся найбольш першапачатковым праяўленнем чалавечага духу, застаецца жыватворным каранём таксама і для ўсіх будучых яго тварэнняў» [3, с. 59].

Чалавечы інстынкт як фізіялагічная з'ява мае складаную структуру. Можна меркаваць, што тут псіхічны элемент уключае першавобразы быцця. Яны існуюць несвядома, фармуючы чалавечыя паводзіны, надаючы ім характар і агульначалавечы, і нацыянальна-этнічны. Архетыпы як універсальныя ўстойлівыя псіхічныя схемы (фігуры) несвядома раскрываюцца і набываюць змест у архаічным рытуале, міфе, сімвале, вераваннях, актах псіхічнай дзейнасці [4, с. 8]. Гэтыя вобразы ўзнікаюць у калектыўным несвядомым, але адкрываюцца індывідуальна, фармуючы першасны, найбольш трывалы і глыбокі, светапоглядны ўзровень (паводле выразу К.Г. Юнга - «фундамент душы») чалавека. Адлюстраваць гэтыя моманты ў творчасці - бадай, галоўная задача мастацтва.

Архетыпічныя вобразы Шляху, Зямлі, Вады, Неба, Сусвету, першасных татэмаў (найбольш глыбока схаваных у падсвядомасці) выступаюць у абедзвюх паэмах. Родны край прадстае ў А. Міцкевіча і Я. Коласа як згублены, неўміручы рай у згаданых касмічна-велічных вобразах. Менавіта праз гэтыя вобразы чалавек імкнецца выйсці за межы канкрэтнага «топаса». І адначасова аўтары (ужо ведаючы, што будзе далей!) са смуткам прадчуваюць, што ў новай прасторы існавання людзі страцяць лад і гармонію адносін паміж сабою і з прыродаю. Што ж, гэта цана, якую чалавек мае заплаціць у пошуках новай суб'ектнасці...

У абедзвюх паэмах Літва-Беларусь шукае сама сябе, яе людзі - свайго ўласнага аблічча, - на розных этапах гісторыі. Паэма «Пан Тадэвуш» аб тым, як не нарадзілася дзяржаўная прыналежнасць тутэйшага люду. Бо скаланізаваная шляхта ў прынёманскім краі не можа стаць дзяржаваўтваральным элементам. Тэрмін «паляк» героі Міцкевіча атаясамліваюць з дзяржаўнай прыналежнасцю [5, с. 3 - 6]. Яны, адчуваючы сваю «іншасць» (ліцвіны!), хацелі б, тым не менш, мець надзею, што адроджаная ад «забору» дзяржава дапаможа ім адчуваць сябе ўтульна на іхняй зямлі. Гэта - шлях да суб'ектнасці больш высокага ўзроўню.

[1] Тэму гэтую своеасабліва працягвае В. Дунін-Марцінкевіч у камедыі «Пінская шляхта», паказваючы духоўна-культурнае вынішчэнне, канчатковы заняпад гэтай грамадскай групы на нашай зямлі.

У «Новай зямлі» ідэя дзяржаўнасці на паняційным узроўні адсутнічае. Дзяржава, у якой жывуць героі, выступае як бязлікае абагульненае зло, як незразумелы, страшны свет чыноўніцтва:

*Лепш іх не знаць, няхай іх цяміць!*
.......................................................
*«Іх» - нешта злое, цемень — сіла,*
*Што душу дзядзькаву муціла;*
*«Іх» - гэта тое, што варожа*
*І ў рог барані сагнуць можа.*
.......................................................
*Забіты дух яго вякамі*
*Ўжо чуе страх перад панамі* [6, с. 301].

Гэта інстынктыўны страх распаду, неладу, без якога немагчымыя пошукі новай суб'ектнасці. У Коласа гэта пошукі сваёй асабовасці тутэйшымі, якія яшчэ добра не ведаюць, што *гэта* павінна называцца «беларус». У абедзвюх паэмах- пакуты развіцця (ці, можа, неразвітасці?) нацыянальна-дзяржаўнай ідэі ў свядомасці тутэйшага чалавека.

Усе свае надзеі аўтары звязваюць з гэтай ідэяй як асновай трываласці свету ў народнай свядомасці. Аўтары спадзяюцца, што стыхійныя жыццёвыя сілы, першасныя асновы быцця не загінуць на ростанях гісторыі. І Міцкевіч, і Колас шукаюць апірышча - сацыяльнага, этнічнага - у адвечных вартасцях, якія нарадзіла і захоўвае родная Глеба. Родная прырода, неўмiручыя вартасці жыцця даюць сілы героям супраньстаяць маральнаму разбурэнню.

Паказваючы пакуты нараджэння беларускай нацыянальнай ідэі, аўтары паэм разумеют», што яна, гэтая ідэя, павінна рэалізавацца як пачуццёвая эманацыя ідэй агульначалавечых - Бога, Сусвету, Лёсу. Гэтыя ідэі існуюць як архетыпічныя ўтварэнні, даючы аснову архетыпічным вобразам у свядомасці паасобных народаў і людзей.

У абедзвюх паэмах ёсць «скразныя» вобразы, якія ўзыходзяць да архетыпаў: Вада, Зямля, Шлях, Рака, Лес і іншыя. Гэтыя вобразы ўтвараюць своеасаблівую сістэму, Згаданая сістэма развіваецца на падкрэслена празаічным матэрыяле (асабліва ў *Я.* Коласа): простыя моманты чалавечага жыцця набываюць глыбіню, перспектыву, уласцівыя велічнай міфалагічнай архаіцы. У паэмах паказваецца лёс дзяржаўнай (у А. Міцкевіча) і нацыянальнай (у Я. Коласа) ідэі. Носьбітам гэтай ідэі можа быць толькі самасвядомы чалавек - прадстаўнік самасвядомай супольнасці. Таму больш старыя вобразы (Вада, Зямля, Шлях, Рака, Агонь, Лес і інш.) не могуць стаць сістэмаўтваральнымі, бо яны - у пэўнай ступені знешнія ў дачыненні да індывідуальна-асабовай самасвядомасці[1].

У паэме «Новая зямля» галоўны герой падсвядома імкнецца да асабістага саманараджэння. Трэба шукаць архетыпічны вобраз, які ляжыць у аснове гэтага выключна індывідуальнага акту. Міхал павінен сустрэцца з самім сабой. А «сустрэча з самім сабой азначае перш за ўсё сустрэчу з асабістым Ценем» [7, с. 112], сустрэчу з «адбіткам» самога сябе ў глыбінях супольнай свядомасці... І вось ён, гэты «дзень»: адным са «скразных» архетыпічных вобразаў абедзвюх паэм з'яўляецца прастары, балцкага яшчэ паходжання, татэм - Воўк. У А. Міцкевіча гэты вобраз дадзены ў міфалагічным сюжэце як устаўны, «ад аўтара» (рамантызму можа быць уласцівы рацыянальны момант). У неарамантычным творы Я. Коласа вобраз Ваўка прысутнічае падсвядома для герояў (і, бадай, чытача) у кожным зруху дзеі. Агульначалавечы архетып лёсу выражаецца ў абедзвюх паэмах праз тыя самыя архетыпічныя вобразы. Але сістэматызуюцца яны па-рознаму. У А. Міцкевіча Лёс звязаны з тэмай Зямлі (Літвы-Айчыны) як «душы» будучага дзяржаўнага ўтварэння. Менавіта Зямля-Айчына з'яўляецца, на маю думку, сістэмаўтваральным вобразам архетыпічнага строю гэтай паэмы. Воўк у паэме А. Міцкевіча выступае як успамін аб пачатку літоўскай дзяржавы і яе славы:

*Ro̸wienniki litewskich wielkich kniazio̸w, drzewa*
*Bialowieży, S̸witezi, Ponar, Kuszelewa!*
*Kto̸rych cien̸ spadal niegdys n̸a koronne glowy*
*Grożniego Witenesa, wielkiego Mindowy*
*I Giedymina, kiedy na Ponarskiej gorże,*
*Przy ognisku mysl̸iwskim na niedzw̸iedziej skorże*
*Leżal, sluchajqc piesn̸i mqdrego Lizdejki,*
*A Wiliji widokiem i szumem Wilejki*
*Ukofysany, marzyi o wilku zèlaznym...* [8, с. 99]

«Жалезны Воўк» балтаў і літвінаў, Adelwolf, Wehrwolf германцаў - звер, разумнейшы за іншых звяроў (а часам - і чалавека), шляхетны, удалы паляўнічы, які не жывіцца падлінай.

---

[1]Сістэма, дарэчы, гэта спосаб узаемасувязі структурных элементаў. «Задаецца» гэты спосаб так званым сістэмаўтваральным элементам. *-А.Н.*

У паэме «Новая зямля» пра Ваўка не апавядаецца - ён там жыве. Галоўны герой і Воўк літаральна ідуць па слядах адзін аднаго. Вобраз Ваўка звязвае тэму Лёсу з тэмай індывідуальнай душы, яе пакутлівага развіцця. Татэмны звер - прарадзіцель народа, носьбіт духоўна-душэўнага пачатку гіне ў паэме тройчы: змываецца «жывой вадой» (у палонцы), знішчаецца ў сваёй рэпрадукцыйнай ролі (пагібель Ваўчыхі на шчаненні ў паляўнічай байцы аднаго з «падпанкаў»), змываецда «мёртвай» вадой (Міхал у перадсмяротным трызненні бачыць сябе ваўком і знікае ў стрыжані). Што тэта - указание, прадрачэнне? Варта прасачыць гэты ланцуг пераўтварэнняў у паэме «Новая зямля».

Міхал гіне, бо яшчэ не можа разарваць кола Лёсу, не можа Лёсу кінуць выклік, не можа зрабіць асабіста-адказнага выбару. У паэме - неабходнасць нараджэння новай міфалагемы: пераход ад лёсу-долі да індывідуальна-адказнага лёсу чалавека, блізкага сучаснасці. У паэме паняцце лёсу не толькі ўбірае ў сябе старыя міфалагічныя значэнні, але і дапаўняецца сучаснымі сацыякультурнымі і этычнымі асацыяцыямі. Паняцце лёсу выступав тут і як момант гарманічнага зліцця з прыродай, і як вытворнае канкрэтнага сацыяльнага часу і прасторы ў стане іх рэалізацыі праз чалавека.

Асноўная (але не наяўная) тэма «Новай зямлі»- вылучэнне чалавека як асобы з Роду. «Невылучэнне» чалавека патрабавала б іншых сістэмаўтваральных элементаў архетыпічнага ладу - Зямля, Вала, Агонь, Лёс былі б такімі «безасабовымі» элементамі, стыхійна арганізуючымі дзеі гэтага кутка Сусвету. Але Род не знікае. Род - гэта ўсё чалавечае, тое, што было, ёсць і будзе. Гэта пачатак, канец і новы пачатак жыцця як самаўтварэння. Татэм- нейкая функцыя Рода, зародак яго новага існавання на новай ступені, на ўзроўні індывідуальнай самасвядомасці. Але новае апірышча гэтага працэсу - у падсвядомасці чалавека, які належыць да Роду, пакуль Род існуе. Колас паказвае пачатак, - не, патрабаванне! - свядомага змагання за Род, за родны кут, за новага чалавека-асобу на годнай аднаўлення зямлі. З Лесу - да Лёсу!.. Да лёсу ўласнага, індывідуальнага, грэшна-пакутлівага, але свайго!. Ці не Купалаўскае «людзьмі звацца» адгукнулася тут? Адыходзячы з жыцця, Міхал кажа брату:

*«Зямля... зямля... туды, туды, брат,*
*Будуй яе... ты дай ёй выгляд...*
*На новы лад, каб жыць нанова...»* [6, с. 334]

Не, гэта ўжо не прыгожая, ідылічная мара аб уласным кутку для сваёй сям'і: у паэме гучаць матывы трагічнай няўцешнасці. Разважанні аб зямлі, яе набыцці нагадваюць магічныя заклінанні:

*«Зямля не зменіць і не здрадзіць,*
*Зямля паможа і парадзіць,*
*Зямля дасць волі, дасць і сілы,*
*Зямля паслужыць да магілы,*
*Зямля дзяцей сваіх не кіне,*
*Зямля - аснова ўсёй айчыне»* [6, с. 266].

Гэта ж аб усёй нашай зямлі, аб Беларусі, аб Айчыне нашай, нашых бацькоў і нашчадкаў!

Колас заклінае нас зберагчы зямлю:

*«... з гэтай спадчынай сквітацца,*
*Што засталася ад бацькоў -*
*Зямелькі некалькі шматкоў...»* [6, с. 283]

Зберажыце Беларусь, зямлю нашага Рода! У гэтым нам дапамогуць старыя, уласцівыя толькі нам, беларусам, вобразы.

Вернемся да «воўчай» тэмы ў паэме. Да першай пагібелі (у палонцы) Воўк выступав ў паэме літаральна дзевяць разоў (эпасныя тры разы па трое). Гэта - звыклыя ў нашай будзённай мове выразы:

*«А, дурань, воўча тваё мяса!»* [6, с. 43]

* * *

*«Глядзіць, як воўк той, заўжды крыва...»* [6, с. 91]

* * *

*«І не сабака страшны воўку,*
*А непрыемна яго звяга.»* [6, с. 92]

* * *

*«А тут, як дзе на воўчай гаці...»* [6, с. 95]

* * *

*«Ваўчком Аленка пазірае...»* [6, с. 128] і г.д.

Як кажуць: «Аб воўку памоўка- ды воўк на парог!» Ужо не ў прыказцы, не ва ўспаміне з'яўляецца рэальны воўк. Паны і падпанкі загадваюць:

*«Ісць Міхалу пад буданы*
*Сачыць ваўкоў...»* [6, с. 100]

Міхал павінен уласнымі рукамі знішчыць *Ваўка...* Знішчыць зародак самога сябе як асобы ў той момант, калі Воўк змог бы яго вывесці з Роду, не разарваўшы сувязі з Родам! І ўпершыню (адзіны раз!) у паэме з'яўляецца тэма (не, цень!) ваўкалацтва:

*«Тут, пэўна, шэорацца ваўкі*
*І злыдні ходзяць, ваўкалакі...»* [6, с. 144]

Так падрыхтоўваецца «пераўтварэнне» Міхала. Ваўкалак - гэта чалавек, які прымае вобраз татэму перад вялікім выпрабаваннем. Так Род дапамагае чалавеку не згубіць самога сябе. Усім сэрцам, душою адчувае Міхал сваё пабрацімства з прыродай. З лесам зліты ягоны Род. Аднак Міхал- ужо не інстынктыўная істота, хоць і не мае ўсяго трагічнага вопыту самога аўтара паэмы. Міхалу ўжо вядома пачуццё няўстойлівасці быцця, здзіўлення перад жыццёвымі выпрабаваннямі. Думка аб нарастаючай дысгармоніі «чалавек - прырода - зямля» увесь час прысутнічае ў паэме. Твор набывае своеасаблівую, вельмі далікатную меланхалічнасць, якую толькі падкрэсліваюць жыццелюбівыя пабытовыя сцэны. Шчымлівая, жалобная песня ўрываецца, аднак, у вясёлы сялянскі банкет:

*«Ой, пара ж вячэраць, няма бацькі дома,*
*Ці яму дарожка гэта незнаемa?*
*Ці ён памыліўся, ці конічак збіўся,*
*Ці сярод дарогі ён адзін спыніўся?*
*Блудная дорога, ды конь яе знае,*
*Толькі ж конік волі сам прыйсці не мае...*
* * *
*...І нейкі жаль няяснай страты*
*Ад гэтай песні патыхае...»* [6, с. 144]

Героі паэмы ўжо задаюць пытанне аб сваім уласным лёсе, аб тым, як кола лёсу разарваць, не згубіўшы саміх сябе. Яны не хочуць разбурэння старога свету, не блюзнерствуюць, не злуюць. Свет - гэта дадзенае Богам. Змяніць трэба сябе самога. Гэта вельмі цяжка, бо пагражае разбурэннем, нават пагібеллю. Таму пошукі зямлі набываюць рысы няўцешнасці: усё раскрадаецца падчас пярэбараў, гарыць у пажары, героі жывуць у зямлянцы, літаральна зарыўшыся ў зямлю - родную зямельку («,..што засталася ад бацькоў - зямелькі некалькі шматкоў...»). Г эта ж Беларусь гарыць, гэта ж нашу Айчыну раскрадаюць!

На дапамогу Міхалу імчыцца праз лес Воўк. Але Міхал не пазнае яго, хоча... забіць, бо не адчувае старадаўняй сувязі з татэмам. А Воўк, зусім не «жалезны» - бедны, зацкаваны звер ляціць праз раку і гіне ў палонцы:

*«Стрыжэнь глыбокі, лёд пакаты,*
*А бедны воўк вадой падцяты*
*Скрабе па лёдзе кіпцюрамі*
*І носам рые, як зубамі,*
*Іўвесь пружыніцца і рвецца,*
*Але нічога не ўдаецца*
*Іўсё слабееў воўка сіла* [6, с. 177] (падкрэслена мною. *-А.Н.)*

Прарочыя словы!

Тэта першая пагібель Ваўка. Воўк

*«...ускінуў погляд на Міхала*
*Глядзіць, як бы* ратунку *просіць...*
*Так вочы жаласна глядзяць...*
*...І знікла ўсё: жыццё, змаганне*
*І прагавітасць палявання.*
*Міхал стаіць і разважае,*
*А потым голаву ўскідае,*
*Як бы ён хоча запытаць:*
*«Ну, што ты скажаш, брат, на гэта?»* [6, с. 178]

Звернем увагу на апошні радок: ён з іншымі не рыфмуецца. Чаму? Можа, каб чытач разам з Міхалам падумаў? Аб чым жа? Баюся нават аб гэтым гаварыць, але ж нешта перадаў Воўк Чалавеку, які трагічна ўспрыняў ягоную воўчую пагібель у чыстай, празрыстай вадзе.

І пасля гэтага здарэння тэмп аповяду паскараецца, цыклы «адраджэнне- разбурэнне» прысплшаюцца. Адчуваецца бяда. Яна ўсё бліжэй. Не, не ўбачыць Новай Зямлі Міхалу! Але не забывайма, што Воўк у палонцы глядзіць на Міхала, як бы «ратунку просіць» [6, с. 178]. Так, Міхалу наканавана працягваць «воўчую тэму» у паэме. Міхал - ваўкалак?! А хто ж ён такі, калі менавіта ў яго просіць ратунку бедны звер, што згубіў веліч татэму ў пакутлівых дзеях Роду?...

Тройчы, зноў тройчы, вырываецца з рук герояў Коласа Зямля: пярэбары, пажар, няўдалае набыццё новай сядзібы. Што ж, бедны, нямоглы звер-татэм, якому «далі дзесь жаху», не можа абараніць людзей свайго Роду - ён сам просіць у іх ратунку. Міхал - нашчадак хворага Ваўка з жахам у вачах, зусім не «жалезнага», - хварэе целам і духам. Але ўсё адно яго не пакідае мара:

*«Купіць зямлю, прыдбаць свой кут,*
*Каб з панскіх выпутацца пут,*
*І там зажыць сабе нанова,*
*Свая зямля - вось што основа...»*

Так Міхал імкнецца змяніць «механізм» цыклічнасці жыцця - знешні, аб'ектыўны - на свой уласны, незалежны, грэшна абраны, адказны. Гэта ўласны, якасна новы, пачуццёвы выбух у светаўспрыманні Міхала [6, с. 74]. У воўчым абліччы лягчэй прайсці «родавыя пакуты» нараджэння. Ваўкалацтва- адмаўленне ад сябе, калі чалавек у чарговы раз пакідае абжыты край звычайных уяўленняў. Міхалу і героям Коласа трэба прыйсці з прыроднага («дачалавечага») у «чалавечае», сацыяльнае быццё'. Вось чаму Міхал прымае дапамогу Ваўка, але, як ужо гаварылася, Воўк згубіў сваю «жалезную моц...»

Прырода памятае пагібель Ваўка. «Ваўчыныя выразы» з паэмы знікаюць зусім. Апавяданне робіцца містычна-драматычным. «Таемныя гукі прыроды» падрыхтоўваюць працяг трагедыі:

*«Настане ноч -усюды ціха,*
*Хіба завые дзе* ***ваўчыха*** (не воўк - яго няма! - *А.Н.)*
*Сярод трушчобы ў цёмным лесе...*
*...Але што гэта? Што за гукі?*
*Адкуль яны? Чые то рукі*
*Забілі цяжка малаткамі,*
*Як тыя коні капытамі?* [6, с. 209]

Міхал не самотны са сваім страшным і адказным лёсам, бо па Ваўку вые Ваўчыха... Ёсць надзея на «новы лад, каб жыць нанова...»

Але рыхтуецца другая пагібель Ваўка. Радзівілаўскія падпанкі хваляцца паляўнічымі прыгодамі:

*«А я...*
*Седм вілкув забів едным стжалэм!*
*... У концы дае ім тлумачэнне:*
*Забіў ваўчыцу на шчаненні*
*...І доўга ўсе яны смяялісь»* [6, с. 232].

Воўк ізноў гіне - тым разам у сваёй рэпрадукцыйнай, так бы мовіць, функцыі. Ваўка - няма. Тым больш адказная роля Міхала-ваўкалака. Дзея паскараецца, меланхалічны настрой паэмы з другога плана выходзіць на першы, перарываючыся драматычнымі нотамі. Але Міхал - сапраўдны прадстаўнік свайго народа: ён не разбуральнік, ён прымае свет як дадзенае. Трагедыя не ў тым, як Міхал успрымае свет, але ў тым, што з Міхалам робіцца. «Воўчая» тэма ў паэме - не фантастычна-рамантычны ці забаўляльны матыў, але адзнака светапогляду, элемент, бадай, яшчэ паганскі, перадлагічнае, далагічнае адчуванне свету і яго «пабудовы».

Уважлівы чытач з горыччу сочыць, з якім адчаем Антось блукае па Вільні, па «воўчым» горадзе, заснаваным ягонымі продкамі. Але горад - такі незразумелы і нават варожы: у ім засела «злое», «цемень-сіла» царскіх чыноўнікаў. Падсвядома, інстынктыўна Антось і ягоны спадарожнік знаходзяць «воўчы след» у гэтым чужым месцы («...А тут - адзін, бо ўсе чужыя...»). Яны ходзяць па тых мясцінах, дзе калісь прымроіўся Жалезны Воўк князю Гедзіміну. Аднак стораж з будкі іх спыняе, бо «безбілетным ход запынен...». Героі ўсё ж узнімаюцца на гару, каб агледзець абразы «палёў, задумаю спавітых», успомніць «дарагія сэрцу спевы». Старажытная моц, сакральнасць аберагаюць душы герояў ад «пылу і смуроду закавулкаў». Тут зноў перасякаюцца дзве паэмы - «Пан Тадэвуш» і «Новая зямля», зноў гучыць адзіная тэма, тэма Зямлі-Айчыны і татэму, які яе ахоўвае і зберагае...

І вось - трэцяя пагібель Ваўка і аднайчасова новая спроба Міхала знайсці яе, Новую зямлю. Так, яна для кожнага з нас паасобку- новая... Смерць. Перад уваходам у гэтую Новую Зямлю Міхал прыпыняецца, бо не можа пераадолець новую мяжу ў сваёй цялесна-чалавечай якасці, у выглядзе чалавека, «растопленага ў прыродзе», хоць і з «воўчай адзнакаю». Воўк з'яўляецца ў паэме ў апошні раз... У перадсмяротным трызненні Міхал бачыць сябе - Ваўком. Замкнулася кола быцця, але апошнім высілкам, апошняй праявай старажытна-воўчай, татэмнай моцы Міхал размыкае, разрывае кола родавага лёсу[1] [2].

---

[1] Можна тут прыгадаць рэпліку аднаго з герояў паэмы, які ідзе да споведзі: «У лесе, браце, грахоў мала...» Мала, бо няма асабістага, адказнага выбару, бо лёс успрымаецца «у лесе» толькі як аб'ектыўны фактар. - *А Н.*

[2] Ваўкалацтва давала чалавеку сілу ў іншым абліччы, не парушаючы татэмных традыцый, пераадолець бінарныя супярэчнасці, як, напрыклад, Зямля - Неба, Зямля - Вала, Агонь- Вала, Жыццё- Смерць і інш. Гэта- з'явы «дачалавечага» ўзроўню. Перайсці з гэтага ўзроўню на новы - «чалавечы» - ваўкалак не можа. - *А.Н.*

Ён перадае мажлівасць знайсці Новую зямлю брату Антосю. Але гэта будзе адначасова і зямля новага чалавека, адказнага перад сабой і Богам за ўласны выбар. Так праяўляецца перарыўнасць развіцця, вызваляючы мажлівасць развіцця на якасна новай ступені. Толькі б не ўпасці у больш глыбокія, бессвядомыя пласты душы! Гэта - выхад з падсвядомага да свядомага. Міхал сустракаецца са сваім ценем, пазнае яго, але не выракаецца. Гэта не праекцыя на нешта вонкавае: усё адбываецца ў душы героя і аўтара. І- чытача. Воўк - не знешняя сіла, ён належыць архетыпічнаму, далагічнаму пласту свядомасці і героя, і аўтара. Але, у адрозненне ад героя, аўтар хоча, каб мы гэты феномен рацыянальна ўсвядомілі і акрэслілі яго месца і значэнне.

Фінал паэмы драматычны, але гэта заканамерна. Канфлікт паміж Лёсам і мажлівасцю чалавечага выбару (свабодай) ніколі не можа быць вырашаны да канца. Воўк як архетыпічны вобраз аб'ядноўвае дачалавечы стан быцця, чалавечы (які толькі пачынаецца) і звышчалавечы - у касмічнае адзінства, вяртаючы чалавека (як свядомую свайго стану асобу) Роду. Колас не сумняваецца, што тэты прагрэс неабходны, мэтазгодны, ды героі паэмы не могуць яшчэ ўявіць сабе аблічча сіл, здольных «кіраваць» працэсам. Але словы Міхала - паслухаем яшчэ раз:

*«- Антоська!.. родны мой! Канаю...*
***Перагарэў, адстаў, знікаю...***
*Вядзі ж ты рэй, вядзі...* ***адзін***
***Як лепшы брат, як родны сын.***
***Бог не судзіў мне бачыць волі***
*І кідаць зерне ў свае ролі...*
*Зямля...зямля... туды, туды, брат,*
*Будуй яе...* ***ты дай ёй выгляд...***
***На новы лад, каб жыць нанова...»*** [6, с. 333 - 334] (падкрэслена мною. -А.Н.)

У паэме - заклік да стварэння новага чалавечага свету для чалавека-беларуса. Прароча гучаць радкі:

*«Пара, пара ў дарогу,*
*Бо час прыстаць к свайму порогу,*
*Пакулъ жаданне не астыла,*
*Пакулъ ахвота ёсцъ і сіла»* [6, с. 267].

* * *

*«І гэта думка аб зямлі*
*Запала ў сэрцы назаўсёды,*
*Як промень волі і свободы...»* [6, с. 109].

Сцэна пагібелі, смерці Міхала - вельмі важная для разумения ўсяго твору:

*«...І ўсё прапала,*
*Няма і почуту Міхала.*
*Куды ж ён дзеўся? Дзе ён, дзе?*
Эх, *быць бядзе! Ну, быць бядзе!..*
*Ах, не: вунь ён! Ён воўкам стаўся,*
*Бяжыць, як можа - знаць, спужаўся.*
*Ой, ой - стрыжэнь! Ён - гоп туды!*
*Ніяк не вылезе з вады.*
*Капут... Міхал-воўк прападае,*
*Пад лёдам знік, як мыш рудая»* [6, с. 332].

Што гэта - пагібель татэму, Роду, народу? Сцэна дакладна паўтарае тое, што адбылося з Ваўком. А мыш - сімвал царства памерлых у міфалогіі большасці народаў Еўропы. Ваўка няма. Але мыш «рудая» - «руда» - «кроў» - ці не надзея гэта на новае адраджэнне? Смерць - з'ява амбівалентная, яна прадракае нараджэнне новага. Аб гэтым піша сам Я. Колас:

*«Конец - і нейкі круг замкнуты*
*У небыццё ідзе і гіне,*
***Каб месца іншай даць часіне...»*** [6, с. 316] (падкрэслена мною. - *А.Н.)*

*Я.* Колас намагаецца ўлавіць аблічча таго «нечага», што кіруе чалавекам, і што здольна прывесці наш народ да новага духоўнага стану, да Новай зямлі. Дарэчы, М. Бердзяеў адзначае тры перыяды ў працэсе ўсведамлення чалавекам гістарычнага працэса:

1) «арганічнае ўспрыманне гістарычнага парадку: пазнанне задаволена фіксуе гэты парадак, тоеснасць чалавека з прыродай («дачалавечае» - *А.Н.*)];

2) «смута»: нараджэнне новага гістарычнага ўкладу, няма гэтай тоеснасці («чалавечае» - *А.Н.)*

3)пачатак пазнання гісторыі чалавекам [9, с. 442]. Супрацьпастаўленне сябе гісторыі, калі чалавек свядома ўключае і выключае сябе з гістарычнага працэса («звышчалавечае» - *А.Н.).* У паэме - пачатак смутнага перыяду ў жыцці нашага народа. Страх за будучыню - «эсхаталагічны неспакой» не толькі наш, беларускі, але і агульнаславянскі [10, с. 185]. Імкненне да адзінства шляху прымушае людзей адчуць бясконцасць іх блукання, іх вандровак у Сусвеце. Таму так важна знайсці тэарэтычна і адчуць душой, калі тэта мажліва, сістэмаўтваральны элемент, які б упарадкаваў усю сістэму архетыпічных вобразаў у падсвядомасці нашага народу, які б выявіў адметнасць нашага гістарычнага шляху, нашага спецыфічнага нацыянальнага светаадчування.

У крызісных гістарычных сітуацыях адбываецца несвядомае ажыўленне архетыпічнага вобраза. Герой дзейнічае з уласнай «архетыпічнай матрыцай» (асабісты лёс?). Гэты працэс адбываецца незалежна ад жадання чалавека. Ваўкалак выконвае «вышэйшую волю». Гэтым самым чалавек выводзіцца на якасна новы ўзровень развіцця, размыкаючы кола лёсу. Гэта праява містычнага светапазнання: у будзённым, звычным «хаваецца» іншае быццё. Гэта - як непасрэдная сувязь з першаасновай свету, далагічная, якую чалавек не можа ні зразумець, ні кантраляваць[1]. Гэтае пазнанне - па-за межамі пачуццёвай і інтэлектуальнай сферы. «Навучыцца» гэтаму немагчыма. Я. Колас зліваецца з героем паэмы, аддаючыся з ім разам вытанчанаму саманазіранню, якое пераходзіць межы будзённай свядомасці і працягвае сваё існаванне ў сублагічных сферах мыслення. Аўтар ведае, што дзіўныя вобразы і сітуацыі (пагібель Ваўка, бачанне самога сябе ў выглядзе Ваўка) на самой справе - выражэнне асабістых глыбінных адчуванняў. Бо Міхал губляе і не хоча згубіць сваё месца, сваю маральную пазіцыю ў гінучым свеце.

Супастаўленне абедзвюх паэм - «Пана Тадэвуша» і «Новай зямлі» - паказвае, што сістэма архетыпічных вобразаў развіваецца: паасобныя вобразы напаўняюцца іншым зместам, нараджаюцца новыя вобразы. Змяняецца і сістэмаўтваральны элемент: у эпоху «чалавечага» ён абавязкова будзе маральным ідэалам, духоўным, натхнёным звыш. Але гэта - чыста тэарэтычны тэзіс, і ён выходзіць за межы аналізу дадзеных твораў. Ясна, аднак, што Якуб Колас прадчувае пакутлівае нараджэнне новай міфалагемы, якая б адпавядала новай сацыяльнай прасторы, новаму чалавеку - Новай зямлі.

Усё, аб чым пішуць А. Міцкевіч і Я. Колас, - гэта эпічная развага над тым, што адбылося. Нічога нельга змяніць. Але аўтары хочуць распазнаць нейкую праўду і пра саміх сябе, перажываючы свой уласны тэкст, знайсці апірышча, паставу, «выгляд» - сваю асабістую Новую зямлю. Паэма Я. Коласа больш накіравана ў будучыню, у адрозненне ад паэмы А. Міцкевіча, якога, як ужо адзначалася, называлі «pogrobowcem starej Rzeczypospolitej». Не, Колас - не магільшчык мінулага. Ён нібыта рыхтуе і свой народ, і сам сябе да будучых падзей, адказных і трагічных, у якіх давядзецца кожнаму з нас зрабіць уласны выбар. Гэта- сублагічнае стаўленне да свайго твору, перад- (ці звыш-?) пачуццёвае перажыванне ўласнага тэкста. Часам здаецца, што гэта сам Якуб Колас разам з Міхалам ператвараецца ў мудрага Ваўка - старажытны сімвал нашага Роду, каб паказаць (і зразумець!) Лёс, Зямлю, Ваду, Агонь, Дарогу-Шлях, Жыццё і Смерць.

Паэма «Новая зямля» - вытанчанае мастацка-філасофскае, псіхалагічнае даследаванне агульначалавечых архетыпаў і архетыпічных вобразаў, уласцівых культуры і светапогляду чалавека-беларуса, адметнасці яго Шляху і Лёсу, асаблівасцей кшталтавання яго нацыянальнага пачуцця. Героям абедзвюх паэм уласціва трывалае і моцнае пачуццё жыцця пры ўсёй трагічнасці сутыкненняў з Лёсам. У лясным кутку адбываюцца таемныя, сакральныя справы прыроды. Гэта адвечны кругазварот жыцця, які ўцягвае ў свой магутны рытм і самога чалавека, адначасова кшталтуючы яго сацыяльныя якасці. «Пабытовасць» паэм пазбаўлена будзённасці. Жыццё прыроды такое ж велічнае, як і жыццё людзей з усімі яго дробязямі. У паэмах няма рэчаў і падзей «другарадных»...

Паэма Якуба Коласа «Новая зямля» нарадзілася не проста пад уплывай твору Адама Міцкевіча. Дзеі абедзвюх паэм адбываюцца ў супольнай прасторы[2], паэмы аб'ядноўвае супольная духоўнасць. Толькі так мы можам зразумець шматлікія рэмінісцэнцыі, «скразныя» архетыпічныя вобразы.

---

[1]Так, напрыклад, тэма смерці ў палонцы, «стрыжнявая» у паэме, нібыта падрыхтоўваецца выпадковым, на першы погляд, выказваннем Міхала:

*«Бог дасць, сяго-таго прыдбалем,*
*Дабра якога дачакаем,–*
*Так разважаў сваю ён жонку:*
*Жывым не кінешся ў палонку»* [6, с. 35].

[2]Тут трэба адрозніваць паняцці прасторы і лакалізацыі. Лакалізацыя прадугледжвае канкрэтныя факты, «эмпірыку» акрэсленага дзеяння паасобных герояў, «дадзенасць мясцін» і г.д. Прастора ж мае характар духоўны, сімвалічны. - Гл.: Herman Mayer. Rsztaltowanie przestrzeni i symbolika przestrzenna w sztuce narracyjnej // Pami?tnik literacki. - 1970. - Z. 3.-S. 254.

Не забывайма, што аўтар «Новай зямлі» быў Якубам Коласам толькі для нас. Для сябе ён быў і застаўся Міцкевічам. Чым гэта было для яго? Мы ніколі пра гэта не даведаемся. Паэты адыходзяць - застаюцца творы. Адзінаццаць тысяч радкоў- «Пан Тадэвуш». Адзінаццаць тысяч радкоў- «Новая зямля»... Аб Воўку намоўка!..

## ЛІТАРАТУРА


1. Веселовский А.Н. Историческая поэтика / Ред. В.М. Жирмунского. - Л., 1940.
2. Czeslaw Milosz. Historia literatury polskiej do roku 1939. - Znak, Krarow, I993.
3. Юнг К.Г. Современность и будущее. - Мн.: Университетское, 1992.
4. Литературный энциклопедический словарь. - М.: Советская энциклопедия.
5. Мархель Ул. «Пан Тадэвуш» і «Новая зямля», або дзве ментальнасці аднаго архетыпа // Кантакты і дыялогі. - Мн., 1998. - № 7 - 8.
6. Колас Я. Новая зямля. - Мн.: Народная асвета, 1975.
7. Юнг К.Г. Об архетипах коллективного бессознательного // Архетип и символ. - М., 1991.
8. Adam Mizkiewicz. Pan Tadeusz. - Czytelnik, 1934.
9. Бердяев Н. Смысл истории. - М., 1989.
10. Конан У. Быццё і час у люстэрку паэзіі (Нататкі пра творчасць Яна Чыквіна) // Ян Чыквін. Далёкія і блізкія. - Беласток, 1997.